# НЕКАТОРЫЯ ПЫТАННІ
# ЭТНАКУЛЬТУРНАГА ВЫХАВАННЯ АСОБЫ

**Ражкова Л.Л.**
*кандыдат педагагічных навук, дацэнт кафедры беларускай народна-песеннай творчасці*
*УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*
*(Рэспубліка Беларусь, г. Мінск)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пашырэнне і ўзмацненне працэсаў глабалізацыі ва ўсім свеце ставяць перад нашай дзяржавай, як і перад іншымі, праблему захавання, зберажэння сваёй нацыянальнай своеасаблівасці. Менавіта гэтыя абставіны сёння істотна ўплываюць на фарміраванне этнасацыяльнага і культурнага вопыту падлеткаў. Відавочным з'яўляецца тое, што ад таго, якія каштоўнасці будуць сфарміраваны ў падрастаючага пакалення, залежыць далейшае развіццё нашай этнасацыяльнай супольнасці. У гэтай сувязі этнакультурнае выхаванне асобы становіцца адной з важнейшых задач сучаснага выхаваўчага працэсу, а глыбокае вывучэнне зместу і структуры гэтай з'явы, сродкаў, метадаў і ўмоў паспяховага выхавання падаецца вельмі важным і неабходным.

Апошнія тэарэтыка-практычныя даследаванні феномену этнічнага ў псіхалогіі засяроджваюць нашу ўвагу на прынцыпе полісістэмнасці інтэрактыўнага ўзаемадзеяння індывідуальнасці з этнакультурным светам для пераадолення супрацьстаяння і разрыву паміж прыродай чалавека і соцыўмам, працэсам індывідуалізацыі (індывідуальна-асаблівага) і сацыялізацыі (сацыяльна-тыпавога, змяшчаючага ў сабе родавы псіхакультурны патэнцыял чалавечай супольнасці), што дазваляе вывучыць працэс пераўтварэння этнакультурнага свету ў свет індывідуальнасці, і працэс уваходжання індывідуальнасці ў этнакультурны свет, стварэнне ёю розных пацернаў чалавечай культуры [3].

Згодна тэкстам фальклорных узораў народная самасвядомасць [5] мела наступныя формы: мясцовую, сацыяльную, этнічную (праяўлялася ў форме саманазвы этнасу – у спажыванні этноніма) і рэлігійную. Аналіз наяўнасці розных форм народнай самасвядомасці ў фальклорных творах праводзіўся Ю.І. Смірновым [1]. За аснову для аналізу аўтар узяў тэксты са зборніка П.В. Шэйна, у якім налічваецца каля 800 узораў фальклорных твораў рознай жанравай накіраванасці. "Матэрыялы да вывучэння побыту і мовы рускага насельніцтва Паўночна-Заходняга краю …" з'яўляюцца адной з першых грунтоўных прац па вывучэнні народнай творчасці беларусаў. Гэтая праца зафіксавала змест самасвядомасці народа, якім ён быў менавіта ў феадальную эпоху, яшчэ не кранутую капіталістычнымі адносінамі, якія нараджаюцца, бо працэсы фальклорнай творчасці крыху спазняюцца адносна сацыяльна-гістарычных падзей.

Значна раней за ўсе віды народнай самасвядомасці ўзнікла яе мясцовая форма, якая характарызуецца словам "тутэйшы", праяўляецца ў называнні насельніцтвам сябе "мясцовымі", "тутэйшымі". Гэтая форма народнай самасвядомасці, безумоўна, адна з самых зменлівых, рухлівых падчас

міграцыйных працэсаў. Мясцовая форма больш яскрава выяўлена ў пласце раннетрадыцыйных твораў (у каляндарна-абрадавых і сямейна-абрадавых песнях, казках). Так нашы продкі ў казках ці абрадавых тэкстах пазбягалі вызначаць этнічную прыналежнасць сваіх герояў і давалі ім толькі імя. Радзей зазначалася тая ці іншая мясцовасць, паселішча, дзе яны нарадзіліся. Характэрна, што гэтую форму самасвядомасці магчыма знайсці і ў самым старажытным пласце агульнаславянскага існавання, які адлюстраваўся ў фальклорных творах. Так Л.М. Салавей у сваім даследаванні сцвярджае, што група архаічных вобразаў: “Дунай”, “мора”, “явар”, “ціс”, “вінаград”, якія з'яўляюцца бадай што самымі любімымі і пашыранымі ў тэкстах розных жанраў беларускай вуснай народнай творчасці, нясе вельмі значную сэнсавую нагрузку. У рэальных абставінах жыццядзейнасці нашых продкаў яны не знаходзілі прататыпаў. Усім сваім комплексам яны адлюстроўвалі сувязь з іншым геаграфічным арэалам, іншым месцам рассялення – прыдунайскім арэалам існавання славянства. Іх глыбінная напоўненасць зараз не заўсёды ўсведамляецца носьбітамі і спажыўцамі фальклору і ўспрымаецца імі хутчэй як эстэтычная дасканаласць, упрыгожванне, арнаментальнасць [2]. Адсюль, поруч з рэальным тэрытарыяльным рассяленнем беларускага народа, адлюстраваным у яго фальклорнай памяці, прысутнічае і памяць аб калысцы ўсходнеславянскіх народаў, што і зафіксавана ў вобразах прыдунайскага арэалу. Гэта адна з кропак збліжэння народаў-суседзяў пры фарміраванні этнакультурнай самасвядомасці іх прадстаўнікоў у наш час. Не толькі агульначалавечыя каштоўнасці, якія ўтрымлівае фальклор нашых краін, яднае нас, але і памяць аб той даўніне, калі мы ўсе былі адным пранародам.

Даволі поўна ў фальклорных творах прадстаўлены рэлігійная (адлюстраванне ў творах атрыбутаў праваслаўнай і каталіцкай канфесій) і сацыяльная (супрацьстаўленне валадароў польскіх або рускіх і “мужыкоў”, прадстаўнікоў карэннага этнасу) самасвядомасці. Як паказаў аналіз Ю.І. Смірнова, этнічная форма самасвядомасці (адлюстраванне ў творах этноніма народа) сярод іншых форм сустракаецца значна менш. У “Матэрыялах …” П.В. Шэйна вельмі часта сустракаюцца этнонімы іншых краін, такіх як Украіна, Турэцкая зямля. Раз-пораз згадваецца Масква, Русь (Руская зямля) і таксама Польшча. У некаторых зачынах гаворыцца: “Ляцяць гусі з Цёмнай Русі” (№ 377в), ці “Ляцяць гусі з Белай Русі” (№ 404). Але далейшае разгортванне сюжэту не дае нам ніякіх звестак, дзе гэтая мясцовасць знаходзіцца адносна зямлі выканаўцы.

Такім чынам, фальклорная традыцыя захавала і данесла да нашага часу пэўны комплекс форм народнай самасвядомасці. Сярод іх прэваліруюць рэлігійная і мясцовая. Трошкі менш пашырана сацыяльная. Этнічная ж яе форма (і ў гэтым адметная рыса станаўлення беларускай нацыі) у перыяд феадальнай раздробненасці і ў час збірання новай дзяржавы беларусаў праяўлялася слаба. Нязменнае ўладарства на этнічнай тэрыторыі беларусаў (пасля распаду Вялікага Княства Літоўскага) іншаземных прадстаўнікоў не спрыяла яе ўмацаванню.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У наш час на першы план выходзяць другасныя формы фальклору. На дадзеным этапе свайго існавання ён выступае як нацыянальная каштоўнасць. А звязана гэта з тым, што са зменамі, якія адбыліся ў эканамічным жыцці народа, фальклор перастае адыгрываць тую сістэмаўтваральную ролю, якую ён адыгрываў дагэтуль.

Пранікненне капіталістычных адносін у беларускую вёску, адмена прыгоннага права, міграцыя сялян у горад неслі за сабой разбурэнне традыцыйнага асяроддзя, у якім існаваў фальклор, з-за чаго пачалося паступовае разбурэнне і ўсёй фальклорнай культуры. Развіццё таварнай вытворчасці патрабавала сістэматычнага абмену інфармацыяй, знішчэння перашкод для свабоднага абмену ведамі паміж адзінкамі супольнасці. Гэтыя абставіны выклікалі патрэбнасць ва ўніфікаванай форме перадачы інфармацыі, у агульнанацыянальнай літаратурнай мове.

У сваім імкненні максімальна дапасаваць камунікатыўную сістэму да патрэб народа, інтэлігенцыя перапрацоўвае існуючыя этнічныя традыцыі мовы і культуры. У працэсе такой дзейнасці прыходзіць упэўненасць, што фальклор – гэта грамадская каштоўнасць, якую грамадства паступова траціць. Дзеячы культуры ўяўляюць фальклор як неабходную крыніцу этнічных ведаў, матэрыял для пабудовы нацыянальнай культуры, як гарант захаванасці этнічнай своеасаблівасці, крытэрый адрознення адной нацыі ад другой. Зварот да фальклору зрабіўся праграмным і свядомым; ён становіцца аб'ектам пільнай увагі з боку грамадства. Узоры фальклорнай спадчыны вывучаюць і друкуюць. Шырока вядомыя фальклорныя песенныя ўзоры сацыяльнага характару выкарыстоўваюць для кансалідацыі нацыі, таму што яны абуджаюць патрыятычныя пачуцці ў прадстаўнікоў адной этнічнай супольнасці, яднаючы іх.

Абараняючы сваю нацыянальную дзяржаву, выклікаючы ў суайчыннікаў уяўленні аб іх адзінстве, сапраўдных ці выдуманых межах тэрыторыі іх пражывання (Радзімы), дзеячы нацыянальнага адраджэння сцвярджалі права свайго народа на традыцыйную для яго культуру, мову і рэлігію і тым самым, стыхійна альбо свядома, вялі барацьбу супраць мясцовай народнай формы самасвядомасці, па сутнасці фарміравалі этнічную яе форму.

Сапраўдная аднароднасць духоўнай культуры этнасу падчас этнічнай кансалідацыі развіваецца не ў фальклорнай сферы, а ў сферы прафесійнай літаратурнай і музычнай творчасці. Фальклорная традыцыя кожнага этнасу лакальна. Фальклорны рэпертуар складаецца з пэўнай колькасці лакальна-вар'іруемых тэкстаў і тэкстаў, якія распаўсюджаны толькі ў пэўных рэгіёнах, (напрыклад, на Беларусі гэта “Страла”, “Куст”, “Жаніцьба Цярэшкі”). Але фальклорная спадчына ў перыяд станаўлення нацыі актыўна выкарыстоўваецца пры выпрацоўцы нацыянальнай культурнай аднароднасці. Гэты працэс вядзе да стварэння ўмоўна-традыцыйных абагульнёных і агульнанацыянальных форм, якія супадаюць ці не супадаюць з рэальна існуючымі лакальнымі традыцыйнымі формамі. Некаторыя творы (для Беларусі, напрыклад, такія песні, як “Ой рэчанька, рэчанька”, “Купалінка”) становяцца сімваламі, рэпрэзентамі традыцыйнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нацыянальнай культуры, асабліва для прадстаўнікоў беларускай дыяспары ў іншых краінах, адначасова яны складаюць ядро беларускай нацыянальнай культуры.

Але паралельна з выкарыстаннем у прафесійнай літаратурнай творчасці элементаў фальклору, дзеля надання ім нацыянальнага каларыту, і ў самой фальклорнай творчасці паступова ідзе працэс адлюстравання этнічнай (нацыянальнай) самасвядомасці беларусаў. Вынікі яго яскрава бачны ў песнях так званай "савецкай эпохі", дзе ў розных спалучэннях і вельмі часта выкарыстоўваецца этнонім нашай краіны, адлюстравана грамадскае жыццё дзяржавы. Толькі ў "Анталогіі беларускай народнай песні", складзенай Г. Цітовічам, сустракаюцца такія словы і словазлучэнні, як: "Беларусь" (№ 394, 405), "Беларусь, ты бацькаўшчына наша" (№ 392), "атрады беларускіх партызан" (№ 384), "люд наш беларускі" (№ 388), "беларускі край" (№ 408), "з Беларусіі радной" (№ 423).

На нашу думку, ужыванне этноніма ў песенных узорах сведчыць аб тым, што, пачынаючы з 30-х гг. XX стагоддзя, у свядомасць народа ўжо трывала ўвайшлі такія паняцці як "Беларусь", "край беларускі", "народ беларускі". Інакш кажучы, шырокае спажыванне этноніма свайго народа ў сучаснай фальклорнай творчасці сведчыць аб сфарміраванасці ўстойлівай этнічнай (нацыянальнай) самасвядомасці.

Такім чынам, напрыканцы XX – пачатку XXI стагоддзя фальклор ва ўмовах дэнацыяналізацыі паўстае перад намі магутным сродкам фарміравання этнакультурнай самасвядомасці асобы. Усведамленне фальклору як нацыянальнай каштоўнасці, свайго роду адбітка гістарычнай спадчыны нашага народа, гаранта захаванасці этнічнай своеасаблівасці беларускай культуры і нацыянальнай мовы, якое пачалося ў XIX стагоддзі ў колах творчай інтэлігенцыі, зараз толькі ўзмацняецца. На шляху распрацоўкі канцэпцыі этнакультурнага выхавання падрастаючага пакалення трэба дасканала разумець як сучасную этнакультурную данасць, так і мінулую, не дэкларыраваць лозунгі аб этнакультурным выхаванні, а глыбако разумець, што мы робім, як робім і дзеля каго і чаго.

1. *Смирнов, Ю. И.* О народном самосознании: (по фольклорным материалам) / Ю.И. Смирнов // Культура и общество в эпоху становления наций. Центральная и Юго-Восточная Европа в конце XVIII – 70-х годах XIX в. : сб. ст. / АН СССР, Ин-т славяноведения и балканистики ; ред. И.А. Богданова. – М., 1974. – С. 55–62.

2. *Узроўні агульнасці* фальклору ўсходніх славян / Л.П. Барабанава, Г.А. Барташэвіч, К.П. Кабашнікаў [і інш.]. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993. – 477 с.

3. *Хотинец, В. Ю.* Этничность в интегральном исследовании индивидуальности человека: методология, теория, эмпирика и педагогическая практика. На материале исследования коренных народов Западного Урала : дис. … д-ра психол. наук : 19.00.01 / В.Ю. Хотинец. – М., 2003. – 415 л.

4. *Чистов, К.В.* Народные традиции и фольклор: очерки теории / К.В. Чистов. – Л. : Наука, Ленинградское отделение, 1986. – 303 с.

5. *Чистов, К.В.* Этническая общность, этническое сознание и некоторые проблемы духовной культуры / К.В. Чистов // Сов. этнография. – 1972. – № 3. – С. 73–85.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ